# Папаўняецца кніжны фонд

Беларуская дзяржаўная бібліятэка імя В. І. Леніна — буйнейшае кнігасховішча не толькі рэспублікі, але і краіны. Яе фонд штогод папаўняецца вялікай колькасцю мастацкай, палітычнай, навукова-тэхнічнай, сельскагаспадарчай і іншай літаратуры.

Па якіх каналах ідзе камплектаванне бібліятэкі? Сюды паступае абавязковы экземпляр усіх друкаваных выданняў—кнігі, часопісы, брашуры, ноты, карты, што выходзяць у Совецкім Саюзе. Такіх выданняў у мінулым годзе было атрымана 54 тысячы экземпляраў. Аднак аднаго экземпляра кнігі для бібліятэкі часта недастаткова. Таму перыядычныя выданні бібліятэкай выпісваюцца праз «Саюздрук».

Мастацкая і іншая літаратура заказваецца ў тых установах, якімі яна выдавалася або куды паступала пасля выдання.

Ёсць у бібліятэцы імя В. І. Леніна і літаратура, якая выдаецца ў краінах народнай дэмакратыі. Яна атрымліваецца праз спецыялізаваны магазін або па заказу бібліятэкі непасрэдна з-за мяжы, а з Польшчы, Чэхаславакіі і Балгарыі — па міжнароднаму кніжнаму абмену.

Такімі шляхамі бібліятэка імя В. І. Леніна ў мінулым годзе атрымала 123.350 кніг. А сёлета за 8 месяцаў бібліятэчны фонд папоўніўся прыкладна яшчэ 80 тысячамі экземпляраў рознастайнай літаратуры.